■ Рэгіён

# СВЯТА НА ЗЯМЛІ І Ў НЕБЕ

## Дзень горада шчучынцы адзначылі разам з ветэранамі знакамітага авіяпалка і аматарам авіяцыі Леанідам Якубовічам

**Ветэраны 10-га асобнага Маскоўска-Кёнігсбергскага Чырванасцяжнага ордэна Суворава III ступені разведвальнага авіяцыйнага палка, які дыслацыраваўся на Шчучыншчыне, зноў убачылі свой самалёт-помнік МІГ-19 і разам з мясцовымі жыхарамі адзначылі Дзень горада грандыёзным авіяцыйна-спартыўным святам.**


Расійскі тэлевядучы і акцёр Леанід ЯКУБОВІЧ на авіяцыйным свяце ў Шчучыне.

Фота БЕЛТА.

Лётчыкі знакамітага палка пабывалі ў адрэстаўрыраваным палацы Друцкіх-Любецкіх, дзе калісьці размяшчаўся Дом афіцэраў, а затым пад марш аркестра накіраваліся да сімвала горада — самалёта МІГ-19, які ўстанавілі на новай пляцоўцы каля возера.

— Мой лёс непарыўна звязаны з гісторыяй палка, які сёлета святкуе сваё 75-годдзе. І я шчаслівы, што шчучынцы захоўваюць традыцыі горада авіятараў, — кажа **ваенны лётчык першага класа, палкоўнік у адстаўцы гродзенец Леанід КАРПАЎ**, які, дарэчы, 10 гадоў лятаў менавіта на гэтым самалёце — першынцы савецкай звышгукавой авіяцыі.

Сярод ганаровых гасцей былі ў вядомы **расійскі тэлевядучы, акцёр Леанід ЯКУБОВІЧ** — аматар авіяцыі, які ў 2002-м, ужо ў 57-гадовым узросце законны Калужскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча. У яго лётным стажы — кіраванне штурваламі шасці мадэляў самалётаў і двух — верталётаў. Пабываўшы летась у пошуку сваіх каранёў у вёсцы Якубовічы Шчучынскага раёна, Леанід Аркадзьевіч паабяцаў, што гэты візіт не стане апошнім і ахвотна прыняў запрашэнне мясцовых уладаў наведаць авіяцыйна-спартыўнае свята. Што і зрабіў на лёгкаматорным самалёце разам са сваім сябрам, **лётчыкам-інструктарам першага класа, палкоўнікам запасу Казімірам ЦІХАНОВІЧАМ**. Шчучын Казімір Эдуардавіч убачыў упершыню, але тут у авіяцыйным палку ў 1970-х служылі яго аднакурснікі па лётным вучылішчы.

— Я быццам жыву ў небе, гэта для мяне зусім натуральна. Калі людзі моляцца, то яны глядзяць у неба. І калі самалёт ляціць — туды ж глядзяць. Нізкі вам паклон за тое, што захоўваеце авіяцыйныя традыцыі, — удзячны шчучынцам Леанід Якубовіч.

Ён лічыць іх сваімі землякамі: «Уся мая радня з Беларусі, мне дарагія гэтыя мясціны».

Як і на сваім знакамітым шоу «Поле цудаў», Леанід Якубовіч у Шчучыне паводзіў сябе без нейкай зоркавасці — проста, добразычліва. Шмат жартаваў, не адмаўляў у аўтографах і фатаграфаваўся з усімі ахвотнымі.

Нягледзячы на тое, што з мясцовага аэрадрома зараз узнімаецца ў неба не звышгукавая, а лёгкаматорная авіяцыя, шчучынцы сапраўды не забываюць пра свае авіяцыйныя карані. Адроджаны аэрадром дзякуючы мясцовай уладзе, энтузіястам, прадпрымальнікам служыць інтарэсам бізнесу, турызму, ды і сваю першасную функцыю выконвае — тут праводзяцца палёты-экскурсіі.

На Дзень горада ў Шчучын прыляцела каля дзесяці лёгкаматорных самалётаў з розных рэгіёнаў краіны, чые пілоты прадэманстравалі шматлікім гледачам сваё майстэрства кіравання крылатымі машынамі.

Быццам вішанькай на торце сталі паказальныя выступленні лётчыкаў і парашутыстаў Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны. А на зямлі свае каронныя нумары паказалі спецы бранятанкавай тэхнікі, спартыўных аўтамабіляў, атрада міліцыі асобага прызначэння. Тое, што свята праходзіць на зямлі і ў небе, асабліва адчувалася падчас спаборніцтва на хуткасць паміж самалётам і картынгам.

Дарэчы, многія шчучынцы вярталіся са свята з... уласнымі самалётамі. Іх, папяровых, выпусцілі з вышыні больш за 500.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Подых восені ў сярэдзіне жніўня

**На гэтым тыдні па краіне чакаецца пераважна халаднаватае і дажджлівае надвор'е. Яго ўмовы будуць дыктаваць пераважна паветраныя масы з паўночнага захаду Еўропы. Пра гэта паведамілі ў Белгідраметэацэнтры.**

Сёння цёплае надвор'е яшчэ не пакіне межы Беларусі. На большай частцы тэрыторыі паветра прагрэецца да плюс 2430 градусаў. Крыху іншай сітуацыя прагназуецца на паўночным захадзе краіны. Франтальны падзел прынясе туды кароткачасовыя дажджы і навальніцы. З-за іх тэрмометры пакажуць не больш за 21—23 градусы цяпла.

А вось з серады расклад за акном рэзка зменіцца. Франтальны падзел будзе пакрысе перамяшчацца і прынясе разам з дажджамі прыкметную прахалоду ў заходнія і цэнтральныя раёны. Уначы чакаецца плюс 10—17, удзень — 18—25 градусаў. Фарпостам спякоты на гэты дзень застанецца Гомельская вобласць — там «падсмажыцца» да плюс 30.

Працягнуць ісці дажджы і ў чацвер. Тэмпература ночы застанецца ранейшай, а ўдзень стане яшчэ свяжэй — плюс 15—22. І толькі жыхарам паўднёвага ўсходу не давядзецца даставаць курткі: там усё яшчэ сіноптыкі прагназуюць да плюс 29.

Па папярэдніх разліках, да канца тыдня пацяплее на 1—2 градусы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Ніхто не забыты

# ПА СЛЯДАХ ГЕНЕРАЛА МАГОНА



**Пошукавікі магілёўскага клуба ВІККРУ падымаюць у Быхаўскім раёне астанкі байцоў 45-га стралковага корпуса**

Вёскі Рыжкаўка, Лісічнік, Прыбярэжжа сталі апошнім рубяжом абароны ў жыцці многіх байцоў 45-га стралковага корпуса пад камандаваннем Эрмана Якаўлевіча Магона. У сярэдзіне ліпеня 1941 года корпус трапіў тут у акружэнне і панёс вельмі цяжкія страты. Імёны герояў, якія склалі ў баях галовы, пакуль застаюцца невядомымі, а вось месцы іх пахавання часткова знойдзены.

— На працягу апошніх 2 гадоў мы шукалі іх праз архівы, падчас разведак на мясцовасці, распытвалі мясцовых жыхароў і сёлета ў маі нашы здагадкі спраўдзіліся, — расказвае **ваенны пісьменнік, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба ВІККРУ Мікалай БАРЫСЕНКА**. — Толькі за адзін аўторак мы паднялі астанкі 13 савецкіх байцоў, знайшлі 5 медальёнаў. Сярод іншых знаходак фрагменты амуніцыі, каскі, процівагазы, асабістыя рэчы байцоў, якія таксама нясуць дадатковую інфармацыю пра апошнія дні іх жыцця.

Пошукавыя работы працягнуцца ў раёне згаданых вёсак да 10 жніўня. Магілёўскім пошукавікам, якія працуюць у адной звязцы з 52-м асобным спецыялізаваным батальёнам, дапамагаюць брэсцкія калегі. Яны спецыяльна прыехалі дзеля гэтага ў Магілёў, бо шмат чаго чулі пра дзейнасць клуба ВІККРУ ў Беларусі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Кантракты

# ГАНДЛЮЕМ ШКЛОМ І ЦЭМЕНТАМ

**Беларусь нарасціла экспарт будматэрыялаў у краіны Еўропы.**

Пачатак года быў для айчынных заводаў складаным — за першы квартал Беларусь прадала іх на суму, якая складае 99 працэнтаў ад прададзеных за аналагічны перыяд мінулага года. Аднак ужо ў другім квартале прадпрыемствы здолелі павялічыць экспарт прадукцыі ў краіны Еўропы на 70 працэнтаў, таму па выніках першага паўгоддзя краіна рэалізавала будматэрыялаў на суму ў 109 працэнтаў ад аналагічнага леташняга перыяду.

«У асноўным, усе нашы еўрапейскія кантракты маюць доўгатэрміновы характар, многія ўключаюць у сябе яшчэ і магчымасць падаўжэння, — паведаміў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ**. — Таму, лічу, што ў гэтым кірунку праведзена вялікая праца». Галоўныя будматэрыялы, якія экспартуе Беларусь, — шкло і цэмент. Асноўныя іх пакупнікі — Германія, Нідэрланды, Польшча, Венгрыя. Вялікага прагрэсу дасягнулі ў экспарце ў Калінінградскую вобласць Расіі.

Што датычыцца экспарту паслуг, то па гэтым паказчыку мы пакуль адстаём ад лічбаў мінулага года — усяго 88,6 працэнта ад леташняга аб'ёму. Тым не менш вялікія праекты ў Расіі для беларусаў застаюцца актуальнымі. У верасні распачнецца будаўніцтва новага дома ў Калузе, які стане першым у цэлым «беларускім квартале».

Адказаў Анатоль Чорны і на пытанне аб дэфіцыце цэменту, з якім сутыкнуліся цяпер беларускія будаўнічыя прадпрыемствы. «Магутнасцяў нашых заводаў для забеспячэння ўнутранага рынку хапае, — сказаў ён. — Аднак унутранае спажыванне цэменту ў пачатку года было вельмі нізкім, гэта і падштурхнула нас да пошуку новых рынкаў за мяжой. Павялічылі экспарт з 80 да 180 тысяч тон, удалося скараціць складскія запасы. А пасля гэтага ўзнік ажыятажны попыт з боку нашых прадпрыемстваў. Яны прывыклі атрымліваць тавар імгненна, а плаціць потым. Сумарная запазычанасць айчынных забудоўшчыкаў па цэменце цяпер складае 1 трыльён недэнамінаваных рублёў. Таму нам прыйшлося патрабаваць ад іх перадаплату. Акрамя таго, мы ўжо не маглі адмовіцца ад паставак нашым замежным партнёрам, бо адразу страцілі б гэтыя рынкі і не змаглі на іх вярнуцца».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Ну і ну!

# РАЗВІТАЎСЯ ЎЖО З ЧАТЫРМА МАТАЦЫКЛАМІ

**У зоне адсялення Добрушскага раёна дзяржінспектары Гомельскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі міліцыі затрымалі мужчыну, які сеткамі лавіў рыбу на возеры Равучым. З нелегальным уловам — 12 кілаграмамі рыбы — ён ужо выпраўляўся дадому на матацыкле.**

— У 2013 годзе за здабычу рыбы пры дапамозе электралавільнай установы ён быў прыгавораны да двух гадоў пазбаўлення волі, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ**. — Сёлета ў студзені ён прыцягваўся за лоўлю сеткамі да адміністрацыйнай адказнасці. Яго незаконны ўлоў ацэнены ў больш як 4 тысячы рублёў «новымі». У адносінах да рыбака-нелегала заведзена крымінальная справа, а матацыкл канфіскаваны. За тры гады мужчына расстаўся ўжо з чатырма матацыкламі. Транспартныя сродкі ў яго канфіскоўвалі як за перавозку незаконных уловаў, так і за ваджэнне нападпітку. Што цікава, пасведчання кіроўцы затрыманы не меў.

**Дарэчы.** Рыбалка ў зоне радыяцыйнага забруджвання забаронена і з'яўляецца грубым парушэннем правілаў, таму нанесеная з-за такога промыслу шкода налічваецца ў трайным памеры.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Перакладчык Евангелля на «простую» мову

**Добра вядомы ў Беларусі мастак Каміль Камал завяршыў работу над партрэтам дзеяча рэфармацыйнага руху ў Беларусі ў другой палове XVI стагоддзя Васіля Цяпінскага.**



Партрэт — частка творчага праекта, які будзе неўзабаве рэалізаваны ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Мастакі, якія працуюць у старэйшай ВНУ краіны, выкладуць сваё бачанне знакамітых дзеячаў беларускага асветніцтва.

— З вялікай ахвотай працуючы над стварэннем вобраза Васіля Цяпінскага, — дзеліцца сваімі развагамі Каміль Камал, — я, канешне ж, пастараўся зазірнуць у мінуўшчыну. Мне цікава было адкрываць, хто ж такі Васіль Мікалаевіч Цяпінскі. Які ён след пакінуў у гісторыі культуры, асветніцтва Беларусі? Чым ён запомніўся нашчадкам, наступнікам? Пераклаўшы Евангелле на беларускую мову, Цяпінскі, зразумела, думаў пра свой народ, жыў памкненнямі да развіцця свайго роднага краю. Мяне ўразіла, што адна з даўніх публікацый пра майго героя так і называецца — «Пра Васіля Цяпінскага, што пераклаў у XVI стагоддзі Евангелле на простую мову...»

Каміль Камал — уважлівы да кніжнай культуры мастак. Ён аформіў кнігі народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, паэта, празаіка Ганада Чарказяна, Цімура Зульфікарава. Каміль Камал выяўляе сябе і як скульптар. У яго майстэрні — макеты помнікаў вялікім паэтам Усходу Нізамі, Амару Хаяму.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**